Святлана Зыгмантовіч

# БІБЛІЯТЭКІ
## ў сістэме фарміравання і інфармацыйнай культуры асобы

Хуткія тэмпы развіцця новых інфармацыйных тэхналогій, пераход да інфармацыйнага грамадства абумовілі станаўленне такога феномену, як інфармацыйная культура. На сённяшні дзень паняцце «інфармацыйная культура» ўвайшло ў шырокі навуковы ўжытак. У сучасны перыяд ва ўсім свеце дамінантамі грамадскага развіцця становяцца веды і інфармацыйныя тэхналогіі, а інфармацыйны патэнцыял нацыі вызначае яе сацыяльна-эканамічнае становішча ў сусветнай супольнасці. Інфарматызацыя як інтэлектуальна-гуманістычная перабудова ўсёй жыццядзейнасці чалавека і грамадства на аснове ўсё больш поўнага выкарыстання інфармацыі ў якасці рэсурсу развіцця рэзка павысіла значымасць фарміравання інфармацыйнай культуры асобы.

Само паняцце «інфармацыйная культура» з'яўляецца дастаткова шырокім і вызначаецца на сучасным метадалагічным узроўні неадназначна. Сёння існуе некалькі падыходаў да вызначэння гэтага тэрміна. Зыходзячы з таго, што паняцце «інфармацыйная культура» звязана з двума фундаментальнымі паняццямі – «інфармацыя» і «культура» адпаведна выдзяляюць інфармацыйны і культуралагічны падыходы да яе трактоўкі.

Даследчыкі – прыхільнікі інфармацыйнага падыходу да разгляду інфармацыйнай культуры – прапануюць пад інфармацыйнай культурай грамадства разумець сукупнасць ведаў, норм і правіл, каштоўнасцей, створаных у інфармацыйнай дзейнасці, якія адлюстроўваюць пэўны ўзровень яе развіцця (1, с. 146). Аснову інфармацыйнай культуры асобы, лічаць Р.У.Багаева і А.М.Елізараў, складаюць «веды аб інфармацыйным асяроддзі, законах яго функцыянавання, уменні арыентавацца ў інфармацыйных патоках» (2, с. 165). Н.І.Гендзіна пад інфармацыйнай культурай асобы разумее сістэматызаваную сукупнасць ведаў, уменняў і навыкаў, якія забяспечваюць аптымальнае ажыццяўленне індывідуальнай інфармацыйнай дзейнасці, накіраванай на задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей, што ўзнікаюць у працэсе розных відаў дзейнасці (3, с. 6). Большасць даследчыкаў характарызуе сучасную інфармацыйную культуру як якасную дзейнасць чалавека ў галіне атрымання, стварэння, перадачы, захоўвання і выкарыстання інфармацыі.

Пры выкарыстанні культуралагічнага падыходу да разгляду інфармацыйнай культуры яе змест значна пашыраецца. Інфармацыйная культура разглядаецца як неад'емная частка агульнай культуры грамадства і кожнай асобы, як пэўная галіна культуры, як від, як асобы тып культуры, як вынік дзейнасці суб'екта і працэс захоўвання, спажывання аб'ектаў культуры. Па азначэнню аднаго з вядучых спецыялістаў Расіі ў галіне інфарматызацыі Э.П.Семенюка, інфармацыйная культура – гэта «інфармацыйная кампанента чалавечай культуры ўвогуле, якая характарызуе ўзровень усіх ажыццяўляемых інфармацыйных адносін» (5, с. 2). З пазіцый культуралагічнага падыходу, інфармацыйная культура разглядаецца як спосаб жыцця-дзейнасці чалавека ў інфармацыйным грамадстве, як складаючая працэсу фарміравання культуры чалавецтва.

Пры разглядзе інфармацыйнай культуры выкарыстоўваецца і інфармалагічны падыход. Для данага накірунку характэрны разгляд класічных фундаментальных катэгорый, паняццяў, заканамернасцей у інфармацыйным кантэксце: вызначаецца інфармацыйнае разуменне быцця соцыума і прыроды, Сусвету і генетычнага кода, культуры і рэлігіі, фізічных законаў і мастацкай творчасці, эканомікі і кіравання. Менавіта ў межах гэтага падыходу інфармацыйная культура вызначаецца «не як набор элементарных прыкладных ведаў, неабходных кожнаму школьніку, каб не заблудзіцца ў бібліятэцы альбо камп'ютэры, а як методыка, метадалогія і светапогляд грамадства эпохі інфарматызацыі» (6, с. 16). Вызначэнне ролі інфармацыі як фактара, кіруючага грамадскім развіццём, лічаць Ю.С.Зубаў і Н.А.Сляднёва, патрабуе новай парадыгмы – ідэі сучаснага чалавека, метадалагічна і светапоглядна ўзброенага для паспяховага існавання ў інфармацыйным грамадстве.

Сучаснае навуковае пазнанне і вынікі навуковых даследаванняў дазваляюць ацаніць дзейнасць розных суб'ектаў, якія ўдзельнічаюць у фарміраванні як інфармацыйнай культуры грамадства, асобных сацыяльна-прафесійных груп, так і інфармацыйнай культуры пэўнай асобы, вызна-



чыць метадалогію вывучэння і фарміравання інфармацыйнай культуры, распрацаваць структуру, метады і сродкі дасягнення азначанай мэты.

Фарміраванне інфармацыйнай культуры асобы непарыўна звязана з дзейнасцю адукацыйных устаноў. Разам з імі развіццём навыкаў работы з інфармацыяй традыцыйна займаліся і займаюцца бібліятэкі. Бібліятэкамі накоплены даволі значны вопыт у такіх накірунках, як «прапаганда бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў», «фарміраванне культуры чытання». Між тым, змены адукацыйных парадыгм, неабходнасць інфарматызацыі адукацыі ставяць у якасці актуальнай і праблему пэўнай трансфармацыі гэтых напрамкаў работы бібліятэкі. Прычым размова ідзе не проста аб замене адной назвы другой або адказе ад выпрацаваных гадамі форм, не проста аб знікненні неабходнасці фарміраваць і развіваць у карыстальнікаў бібліятэк здольнасці чытацкай дзейнасці, бібліяграфічную культуру – значнасць кожнага з гэтых накірункаў не выклікае сумненняў. Размова ідзе аб новай метадалогіі, якая выпрацоўваецца ў межах інфармацыйна-культуралагічнага і інфармалагічнага падыходаў, мэтавай накіраванасці, актуалізацыі і пашырэнні зместу гэтай работы, пошуку новых форм уласнай дзейнасці і накірункаў супрацоўніцтва з рознымі ўстановамі адукацыі, культуры і інфармацыйнымі цэнтрамі па фарміраванню інфармацыйнай культуры асобы як цэласнай з'явы.

Адным з рацыянальных спосабаў вырашэння праблемы фарміравання інфармацыйнай культуры асобы з'яўляецца, па выніках даследаванняў ук-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

раінскіх і расійскіх даследчыкаў, развіццё сістэмы інфармацыйнай адукацыі шляхам укаранення ва адукацыйныя ўстановы ўсіх узроўняў інтэгратыўнага вучэбнага курса «Асновы інфармацыйнай культуры». Менавіта так у арганізацыйным плане прадугледжвалася і пабудова сістэмы бібліятэчна-бібліяграфічнага навучання ў былым СССР, значная роля ў фарміраванні якой адводзіцца Пастанове ЦК КПСС «О повышении роли библиотек в коммунистическом воспитании трудящихся и научно-техническом прогрессе» (1974 г.). Вялікую ролю ў арганізацыі гэтай работы, яе ажыццяўленні, распрацоўцы прграмна-метадычнага забеспячэння адыгралі бібліятэкі. У многіх школах, сярэдніх спецыяльных навучальных установах, ВНУ гэта работа праводзіцца бібліятэкамі і сёння. Але ёй патрэбны новы імпульс, новы змест.

У выніку шматгадовых даследаванняў выкладчыкамі Кемераўскай дзяржаўнай акадэміі культуры і мастацтваў была распрацавана мадэль праграмы курса «Асновы інфармацыйнай культуры», разлічаная на розныя катэгорыі навучэнцаў: вучняў старэйшых класаў, настаўнікаў, студэнтаў, аспірантаў ВНУ; дадзены апісанні лабараторных работ і метадычныя распрацоўкі ўрокаў; матэрыялы аб сродках дыягностыкі інфармацыйнай культуры асобы (3; 4).

У кожнай праграме пяць раздзелаў: інфармацыйныя рэсурсы грамадства і інфармацыйная культура; асноўныя тыпы інфармацыйна-пошукавых задач і алгарытмы іх рашэння; аналітыка-сінтэтычная перапрацоўка крыніц інфармацыі; структура, правілы падрыхтоўкі і афармлення вынікаў работы; інфармацыйная культура і новыя інфармацыйныя тэхналогіі.

Аналізуючы прапанаваныя матэрыялы, І.Г.Маргенштэрн адзначае наступныя істотныя вартасці праграм: поўны ахоп зместу інфармацыйнай культуры (яе часта абмяжоўваюць пошукам і выкарыстаннем інфармацыі); лагічнасць разгортвання ведаў (ад задавальнення патрэбнасцей у інфармацыі да яе падрыхтоўкі); упор на тэхналагічны кампанент навучання, пад якім разумеецца сукупнасць ведаў і ўменняў, звязаных з адказам на пытанне «як рабіць?» (7, с. 71). Да вартасцей гэтых праграм можна аднесці таксама міждысцыплінарны, інтэгратыўны характар курса, які прадугледжвае выкарыстанне дасягненняў бібліятэчна-бібліяграфічных дысцыплін, інфарматыкі, вылічальнай тэхнікі, логікі, прыкладной лінгвістыкі, псіхалогіі і інш.; практычную накіраванасць курса; арыентацыю на фармалізаваныя, алгарытмічныя метады пошуку і аналітыка-сінтэтычнай перапрацоўкі інфармацыі. Станоўчым з'яўляецца таксама ўключэнне ў праграму тэм, звязаных са знаёмствам і выкарыстаннем новых інфармацыйных тэхналогій, аўтаматызаваных інфармацыйных рэсурсаў, таму што сёння чалавек, які не валодае мінімальнай камп'ютэрнай граматнасцю, практычна выпадае са значнай колькасці сфер грамадскага жыцця.

Аб неабходнасці пераўтварэнняў і ў нашай рэспубліцы сведчаць тыя негатыўныя з'явы, якія характэрны для дзейнасці па фарміраванню бібліятэчна-бібліяграфічнай культуры навучэнцаў. Так, у артыкуле намесніка галоўнага рэдактара часопіса «Бібліятэка прапануе» Л.Несцяровіч, у якім абагульняецца дзейнасць школьных бібліятэк, адзначаецца: «Сёння відавочна, што ў цэлым эфектыўнасць бібліятэчна-бібліяграфічных заняткаў не можа задавальняць ні спецыялістаў бібліятэчнай справы, ні саміх вучняў» (8, с. 28). Прычыны такога становішча: недахоп кваліфікаваных кадраў у школьных бібліятэках; недахоп увагі адміністрацыі школ да бібліятэчна-бібліяграфічных заняткаў (калі заняткі носяць выпадковы характар і праводзяцца непаслядоўна); непаразуменне з боку педагагічнага калектыву (калі бібліятэчна-бібліяграфічныя заняткі замяняюцца дадатковымі прадметамі); нізкі ўзровень бібліятэчна-бібліяграфічнай культуры і інфармацыйнай адукаванасці саміх педагогаў, незадавальняючая база школьнай бібліятэкі (8, с. 28).

Між тым, нават самі метадысты сёння не арыентуюць бібліятэкі на неабходнасць больш шырокага погляду на праблему, фарміраванне не толькі бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў, а інфармацыйнай культуры. Рэкамендуемая «Прыкладная тэматыка бібліятэчна-бібліяграфічных заняткаў» (9) амаль не адрозніваецца ад той, што была распрацавана ў 1976 г., у кожным класе прапануецца па 2–3 тэмы для ўрокаў, тэматыка ў асноўным арыентавана на кнігазнаўчую падрыхтоўку школьнікаў, вучні 10–11-х класаў наогул выпалі з поля зроку бібліятэк, хаця менавіта ў гэтых класах фарміруецца больш за палову ўсёй сукупнасці ведаў і ўменняў па рабоце з інфармацыяй.

Аб невысокім узроўні інфармацыйнай падрыхтоўкі студэнтаў сведчаць даныя сацыялагічных апытанняў, напрыклад, праведзеныя Гродненскім дзяржаўным універсітэтам: толькі 44% чытачоў здольны самастойна знаходзіць неабходную ім інфармацыю і літаратуру; электронным каталогам карыстаюцца 30% апытаных; 50% чытачоў аддаюць перавагу звароту за дапамогай да супрацоўнікаў бібліятэкі (10, с. 85).

Такое становішча – вынік адсутнасці цэласнай дзяржаўнай канцэпцыі інфармацыйнай адукацыі ў рэспубліцы; раз'яднанасці намаганняў арганізацый і ўстаноў, якія ажыццяўляюць фарміраванне інфармацыйнай культуры; адсутнасці спецыяльна падрыхтаваных, валодаючых неабходнымі псіхолага-педагагічнымі ведамі і ўменнямі кадраў; адсутнасці вучэбна-метадычнай літаратуры; тэхналагічнай загружанасці бібліятэчных работнікаў і неабходнасці выконваць асноўныя абавязкі, як правіла, не звязаныя з педагагічнай дзейнасцю.

Між тым, роля бібліятэк у фарміраванні інфармацыйнай культуры асобы не зніжаецца, наадварот, набывае новае значэнне, павышаецца яе актуальнасць, значнасць. Бібліятэка выступае як спецыфічная ўстанова, якая аб'ядноўвае задачы і функцыі інфармацыйнай, культурнай і адукацыйнай арганізацыі. Таму ў параўнанні з іншымі суб'ектамі сістэмы дакументальных камунікацый яна мае магчымасці не толькі забяспечыць доступ да інфармацыі, але і арганізаваць, ажыццяўляць культурна-адукацыйную дзейнасць, накіраваную на фарміраванне ў карыстальнікаў культуры новага тыпу – інфармацыйнай, якая забяспечвае разам з адукацыяй сацыялізацыю асобы. Бібліятэка таксама садзейнічае фарміраванню інфармацыйнай культуры іншых суб'ектаў, якія ўдзельнічаюць у фарміраванні інфармацыйнай культуры грамадства, сацыяльных груп, асобы – бацькоў, выхавацеляў дзіцячых садкоў, настаўнікаў, выкладчыкаў і інш. Менавіта бібліятэкі маюць магчымасць комплекснага падыходу да фарміравання сучаснага ўзроўню інфармацыйнай культуры, якая абапіраецца і ўбірае ў сябе ўсе традыцыйныя формы, тыпы інфармацыйнай культуры: вусныя, дакументныя, электронныя. І, нарэшце, унікальнасць дзейнасці бібліятэкі заключаецца і ў тым, што яна мае сродкі і метады карэкцыроўкі і кіравання працэсам фарміравання інфармацыйнай культуры асобы шляхам канструявання індывідуальнай інфасферы асобы ў межах гуманістычнага супрацоўніцтва бібліятэкара і індывіда; мае і дае магчымасці спалучаць пазнавальную і практычную інфармацыйную дзейнасць асобы ў адпаведнасці з яе патрэбамі.

Асэнсаванне значнасці гэтай праблемы прыводзіць да арганізацыі ў бібліятэках спецыяльных падраздзяленняў, класаў для інфармацыйнага, бібліяграфічнага навучання спажыўцоў інфармацыі. Такія класы працуюць ва універсітэтах, публічных бібліятэках ЗША. Адкрыццё ў Бранскай АУНБ залы электроннай інфармацыі паспрыяла стварэнню спецыяльнай службы, якая павінна не толькі рэалізоўваць комплексную праграму інфармацыйнага навучання



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чытачоў, але і адказваць за падрыхтаванасць карыстальнікаў да новых умоў абслугоўвання.

Па змястоўнай напаўняльнасці паняцце «інфармацыйная культура», безумоўна, больш шырокае, чым «бібліятэчна-бібліяграфічныя веды». Н.Б.Зіноўева лічыць, што змест інфармацыйнай культуры, яе асэнсаванне і мэтанакіраванае фарміраванне павінны ўключаць у сябе некалькі ўзроўняў: светапоглядны, накіраваны на пазнанне законаў і заканамернасцей распаўсюджвання інфармацыі ў грамадстве; маральны, звязаны з выхаваннем асабістай адказнасці, прынцыпаў і пераканання, якія б перашкаджалі вытворчасці, распаўсюджванню і выкарыстанню сацыяльна-дэструктыўнай інфармацыі, дэзінфармацыі; псіхалагічны, што прадугледжвае выпрацоўку аптымальнай рэакцыі на паступаючую інфармацыю, яе адэкватнае ўспрыняцце, фарміраванне ўменняў дзейнічаць ва ўмовах дэфіцыту і лішку інфармацыі; інфармацыйна-прававы, які рэгулюе інфармацыйную дзейнасць асобы як спажыўца інфармацыі; камунікатыўны, што прадугледжвае культуру інфармацыйных зносін і перадачы інфармацыі; кніжны, чытацкі, які арыентаваны на фарміраванне культуры чытання; бібліяграфічны, які мае на ўвазе рэгуляванне, сістэмаарганізацыю, упарадкаванне звестак аб дакументах, якія ўваходзяць у інфармацыйнае поле карыстальніка; лексічны, які садзейнічае ўдасканаленню мовы пісьма, разуменню і выкарыстанню аўтарскіх тэкстаў; інфармацыйна-тэхнічны, звязаны з культурай выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій і аўтаматызаваных сродкаў (11, с. 39; с. 449–450). Усе кампаненты інфармацыйнай культуры ўзаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены.

Такім чынам, на сённяшні дзень у святле разгледжаных вышэй падыходаў вызначэння паняцця «інфармацыйная культура» і яе зместу задачы, якія стаяць перад бібліятэкамі ў гэтым накірунку, можна звесці да трох асноўных блокаў:

- фарміраванне інфармацыйнага светапогляду, што ўключае развіццё ў кожнай асобы ведаў законаў функцыянавання інфармацыі ў грамадстве, разуменне сутнасці новых інфармацыйных пераўтварэнняў, а таксама асэнсаванне свайго месца і задач у інфармацыйным грамадстве, якое фарміруецца;
- дасягненне гармоніі ўсіх кампанентаў, якія ў сукупнасці складаюць інфармацыйную культуру: маральнага, псіхалагічнага, камунікатыўнага, бібліяграфічнага, інфармацыйна-тэхналагічнага і інш., а таксама неабходнага ўзроўню іх развіцця;
- фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў атрымання, стварэння, перадачы, захоўвання і выкарыстання розных відаў інфармацыі.

Не страчваюць свайго значэння і сёння распрацаваныя ў бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве асноўныя прынцыпы бібліяграфічнага, інфармацыйнага навучання спажыўцоў, метадычныя падыходы да гэтай работы, асноўныя формы і метады.

Сярод метадычных патрабаванняў да арганізацыі і зместу гэтай работы выдзяляюцца наступныя: пры вызначэнні зместу інфармацыйнага навучання акцэнт патрэбна рабіць на дзейнасны падыход; трэба не старацца рыхтаваць са спажыўцоў інфармацыі бібліятэкараў, бібліёграфаў, а вызначаць змест ведаў, уменняў і навыкаў, зыходзячы з тых інфармацыйных задач, якія яны павінны вырашаць у ходзе розных відаў дзейнасці (дзеля гэтага патрэбна распрацоўка спецыяльнага праграмна-метадычнага забеспячэння гэтай работы); імкнуцца фарміраваць не асобныя веды альбо ўменні, а інфармацыйную культуру цалкам; змест навучання павінен пастаянна ўзбагачацца, актуалізавацца ў адпаведнасці з тымі зменамі, якія адбываюцца ў сістэме дакументных, інфармацыйных камунікацый; работа па фарміраванню інфармацыйнай культуры розных катэгорыйспажыўцоў павінна праводзіцца бібліятэкамі сумесна з адміністрацыяй навучальных устаноў, выкладчыкамі, іншымі суб'ектамі сістэмы дакументальных камунікацый; неабходна ўлічваць выніковасць, эфектыўнасць работы ў даным накірунку, звязаную з вызначэннем узроўню інфармацыйнай культуры спажыўцоў інфармацыі; для правядзення гэтай работы павінны быць як спецыяльна падрыхтаваныя кадры бібліятэкараў-бібліёграфаў, так і кожны супрацоўнік бібліятэкі павінен валодаць методыкай фарміравання інфармацыйнай культуры спажыўцоў у сувязі з тым, што гэта работа вядзецца не толькі падчас спецыяльна запланаваных мерапрыемстваў, але і штодзённа ў форме парад, рэкамендацый пры абслугоўванні спажыўцоў, іх звяртанні за бібліятэчна-бібліяграфічнай дапамогай.

У інфармацыйным грамадстве змяняецца не толькі тэхналогія дзейнасці бібліятэкі, але і сама асоба як бібліятэкара, так і карыстальніка інфармацыі. На парадак дня паўстае задача фарміравання інфармацыйнага светапогляду, інфармацыйнай свядомасці, інфармацыйных паводзін, гэта значыць фарміравання асобы, якую характарызуе высокі ўзровень інфармацыйнай культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Литература


1. Дворкина М.Я. Информационная культура библиотекаря отдела обслуживания // Информационная культура специалиста: гуманитар. проблемы: Межвуз. науч. конф.: Тез. докл. – Краснодар, 1993. – С. 146–147.
2. Багаева Р.У., Елизаров А.М. Информационная культура и глобальные информационные сети // Информационная культура личности: прошлое, настоящее, будущее: Междунар. науч. конф.: Тез. докл. – Краснодар, 1996. – С. 164–166.
3. Гендина Н.И., Колкова Н.И., Стародубова Г.А. Информационная культура личности: диагностика, технология формирования: Учебн.-метод. пособие. Ч. 1. – Кемерово, 1999. – 143 с.
4. Гендина Н.И., Колкова Н.И., Скипор И.Л. Информационная культура личности: диагностика, технология формирования: Учебн.-метод. пособие. Ч. 2. – Кемерово, 1999. – 137 с.
5. Семенюк Э.П. Информационная культура общества и процесс информатизации // НТИ. Сер. 1.: Орг. и методика информ. работы. – 1994. – № 1. – С. 1–8.
6. Зубов Ю.С., Сляднева Н.А. Человек в пространстве и времени: информационный аспект проблемы // Информационная культура личности: прошлое, настоящее, будущее: Междунар. науч. конф.: Тез. докл. – Краснодар, 1996. – С. 12–17.
7. Моргенштерн И.Г. Технологический подход к формированию информационной культуры // Науч.-техн. б-ки. – 2001. – № 5. – С. 67–73.
8. Несцяровіч Л. Метадычныя парады для бібліятэк, што абслугоўваюць дзяцей, падлеткаў і моладзь // Бібліятэка прапануе. – 2001. – № 1. – С. 27–28.
9. Примерная тематика библиотечно-библиографических занятий в школе // Бібліятэка прапануе. – 2001. – № 1. – С. 28.
10. Гецолд В.С. Вузовская библиотека в социологическом измерении // Вхождение библиотек в информационное общество: поиск гармонии – пути трансформации: Материалы Междунар. науч.-практ. конф. – Мн., 2001. – С. 83–89.
11. Зиновьева Н.Б. Проблемы становления информационной культуры как учебной дисциплины // Библиотеки и ассоциации в меняющемся мире: новые технологии и новые формы сотрудничества: Материалы Восьмой Международной Конференции «Крым-2001»: В 2-х тт. – Судак, 2001. – Т. 1. – С. 449–450; Зиновьева Н.Б Формирование личности нового типа // Библиогр. – 2000. – № 1. – С. 33–39.